ЗАЦВЯРДЖАЮ
Прарэктар
па навуковай працы
ўстановы адукацыі
"Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт
імя Янкі Купалы"
_____________ А.Ф. Праневіч
"____" ______________ 2023 г.

**ВОДЗЫЎ АПАНІРУЮЧАЙ АРГАНІЗАЦЫІ**
ўстановы адукацыі
"Гродзенскі дзяржаўны універсітэт імя Янкі Купалы"
на дысертацыю Вячаслава Віктаравіча Даніловіча
**"Моладзь у грамадска-палітычным, сацыяльна-эканамічным і культурным будаўніцтве Савецкай Беларусі (1921 – 1939 гг.)",**
прадстаўленую на атрыманне вучонай ступені
доктара гістарычных навук
па спецыяльнасці 07.00.02 – айчынная гісторыя

**Адпаведнасць зместу дысертацыі заяўленай спецыяльнасці і галіне навукі**

Змест дысертацыі В.В. Даніловіча "Моладзь у грамадска-палітычным, сацыяльна-эканамічным і культурным будаўніцтве Савецкай Беларусі (1921–1939 гг.)" адпавядае спецыяльнасці 07.00.02 – айчынная гісторыя і галіне "Гістарычныя навукі", па якім дысертацыя прадстаўлена да абароны.

**Навуковы ўклад саіскальніка ў рашэнне навуковай праблемы з ацэнкай яго значнасці**

Навуковы ўклад саіскальніка грунтуецца на выяўленні, сістэматызацыі і аналізе невядомага раней фактычнага матэрыялу, прысвечанага праблеме ўдзелу моладзі ў грамадска-палітычным, сацыяльна-эканамічным і культурным будаўніцтве ў БССР у перыяд 1921–1939 гг. Упершыню ў навуковы зварот уведзены дакументы і матэрыялы 31 фонда 7 архіўных і навукова-даследчыцкіх устаноў Рэспублікі Беларусь і Расійскай Федэрацыі, крытычна пераасэнсаваны навуковыя працы айчынных і замежных даследчыкаў. На гэтай падставе з выкарыстаннем сучасных метадалагічных падыходаў дысертантам праведзена рэканструкцыя ўдзелу моладзі ў грамадска-палітычным, сацыяльна-эканамічным і культурным жыцці БССР у перыяд дзяржаўнага будаўніцтва 1921–1939 гг., што ўключае ў сябе вызначэнне перыядаў станаўлення і развіцця камсамола Савецкай Беларусі; выяўленне асаблівасцяў нацыянальнага маладзёжнага руху; раскрыццё форм палітычнай асветы маладога пакалення і

характэрных рыс дзейнасці камсамольцаў і несаюзнай моладзі ў дзяржаўных органах і грамадска-палітычным жыцці краіны; адлюстраванне ўдзелу моладзі ў вырашэнні сацыяльна-эканамічных праблем і ў развіцці прамысловасці і сельскай гаспадаркі; вызначэнне ролі камсамола і несаюзнай моладзі ў станаўленні і развіцці сістэмы адукацыі і ажыццяўленні культурнага будаўнітва ў рэспубліцы. Дысертантам даказана, што важнымі заканамернасцямі будаўніцтва Савецкай Беларусі, якія стваралі перадумовы для забеспячэння шырокай сацыяльнай падтрымкі савецкай улады, з'яўлялася павелічэнне колькасці моладзі ў органах дзяржаўнага кіравання, забеспячэння яе сацыяльна-эканамічных правоў і ўдзел моладзі ў разнастайных формах культурнага будаўніцтва. Значнасць навуковага ўклада саіскальніка ў вырашэнні пастаўленай мэты вызначаецца тым, што дысертацыя з'яўляецца першай у беларускай гістарыяграфіі навуковай работай, дзе комплексна даследуецца роля моладзі ў грамадска-палітычным, сацыяльна-эканамічным і культурным будаўніцтве Савецкай Беларусі ў 1921–1939 гг.

**Канкрэтныя навуковыя вынікі (з указаннем іх навізны і практычнай значнасці), за якія саіскальніку можа быць прысуджана вучоная ступень**

У дысертацыйным даследаванні В.В. Даніловіча ўпершыню ў айчыннай гістарыяграфіі шляхам комплекснага аналізу сутнасці, характару і тэндэнцый удзелу моладзі ў грамадска-палітычным, сацыяльна-эканамічным і культурным будаўніцтве БССР ў 1921–1939 гг. атрыманы навуковыя вынікі, якія садзейнічаюць асвятленню маладаследаваных старонак гісторыі і культуры Беларусі:

– вызначаны і абгрунтаваны перыяды станаўлення і развіцця камсамола, дадзена характарыстыка зместу і асаблівасцям працы камсамольскіх арганізацый;

– раскрыты змест і формы дзейнасці нацыянальных маладзёжных арганізацый;

– вызначаны і абгрунтаваны перыяды развіцця ідэйна-палітычнай асветы моладзі і дадзена характарыстыка адпаведнай працы камсамола;

– устаноўлены роля і месца камсамольцаў і несаюзнай моладзі ў дзейнасці дзаржаўных органаў улады і формы іх дзейнасці ў грамадска-палітычным жыцці рэспублікі;

– выяўлены дасягненні і недахопы ў дзейнасці камсамольскіх арганізацый і несаюзнай моладзі па вырашэнні сацыяльна-эканамічных праблем, мадэрнізацыі прамысловасці і сельскай гаспадаркі;

– устаноўлены формы і значэнне ўдзелу маладзёжных арганізацый у працэсе станаўлення і развіцця сістэмы адукацыі, дадзена характарыстыка ўкладу моладзі ў культурнае будаўніцтва.

Навізна вынікаў не выклікае сумнення і абумоўлена адсутнасцю ў айчыннай гістарыяграфіі сістэмнага даследавання, самастойным прадметам якога была моладзь у грамадска-палітычным, сацыяльна-эканамічным і культурным жыцці краіны. Яны з'яўляюцца важнымі для далейшай навуковай распрацоўкі праблематыкі палітычнага, сацыяльна-эканамічнага і культурнага развіцця БССР у 1921–1939 гг.

## Адпаведнасць навуковай кваліфікацыі саіскальніка вучонай ступені, на якую ён прэтэндуе

Навуковая кваліфікацыя аўтара дысертацыі В.В. Даніловіча падцвярджаецца зместам дысертацыі і аўтарэферата, поўнасцю адпавядае кваліфікацыі доктара гістарычных навук. Прадстаўленая дысертацыя з'яўляецца самастойна выкананым грунтоўным навуковым даследаваннем, праведзеным на сучасным узроўні. Работа грунтуецца на рэпрэзентатыўнай крыніцазнаўчай базе, прадстаўленай дакументальнымі матэрыяламі, выяўленымі аўтарам у сямі архівах Рэспублікі Беларусь і Расійскай Федэрацыі, а таксама крыніцамі мемуарнага характару. Бібліяграфічны спіс складае 793 пазіцыі. Крыніцы інтэрпрэтаваны з выкарыстаннем разнастайных метадаў (гісторыка-тыпалагічны, гісторыка-параўнальны, гісторыка-сістэмны, структурна-дыяхранічны) гістарычнага даследавання, што павялічвае верагоднасць атрыманых вынікаў.

Вынікі дысертацыйнага даследавання знайшлі адлюстраванне ў 55 друкаваных працах агульным аб'ёмам 101,3 аўтарскіх аркуша, у тым ліку адной манаграфіі, 25 артыкулах у навуковых часопісах і зборніках, уключаных ВАК у Пералік навуковых выданняў Рэспублікі Беларусь для апублікавання вынікаў дысертацыйных даследаванняў, 7 замежных навуковых выданнях. Асноўныя палажэнні і вынікі даследавання былі прадстаўлены на 23 навукова-практычных канферэнцыях. Высновы абгрунтаваны, падцвярджаюцца дадзенымі даследавання, адпавядаюць пастаўленным мэце і задачам, утрымліваюць у сабе новую навуковую інфармацыю.

## Рэкамендацыі па практычным выкарыстанні вынікаў дысертацыі

Матэрыялы дысертацыйнага даследавання могуць быць выкарыстаны для распрацоўкі асобных даследчыцкіх праблем, навукова-тэарэтычнага асэнсавання пытанняў палітычных, эканамічных і нацыянальна-культурных пераўтварэнняў у БССР у 1939–1941 гг., для падрыхтоўкі абагульняючых прац па гісторыі Беларусі. Высновы і матэрыялы дысертацыі могуць выкарыстоўвацца пры выкладанні ў ВНУ такіх вучэбных дысцыплін як "Гісторыя беларускай дзяржаўнасці", "Гісторыя Беларусі ў навейшы час", "Гісторыя дзяржавы і права Беларусі", "Гістарыяграфія гісторыі Беларусі",

“Гісторыя беларускай дыяспары”. Вынікі даследавання могуць выкарыстоўвацца ў выхаваўчым працэсе ўсіх тыпаў навучальных устаноў пры правядзенні мерапрыемстваў з навучэнскай і студэнцкай моладдзю для фарміравання ў яе грамадзянскай і нацыянальнай свядомасці. Для работнікаў органаў дзяржаўнага кіравання і устаноў культуры фактычны матэрыял і высновы даследавання будуць неабходны ў справе рэалізацыі дзяржаўнай маладзежнай палітыкі ў Рэспубліцы Беларусь. Вынікі дысертацыйнага даследавання выкарыстоўваюцца ў навучальным працэсе ў пяці ВНУ Рэспублікі Беларусь (Універсітэт грамадзянскай абароны МНС Беларусі, Акадэмія МУС Рэспублікі Беларусь, Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.С. Пушкіна, Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы, Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт імя Еўфрасінні Полацкай) і Маскоўскім дзяржаўным універсітэце імя М.В. Ламаносава, аб чым сведчаць акты ўкаранення.

**Заўвагі па дысертацыі**

У цэлым станоўча ацэньваючы разглядаемую дысертацыю, неабходна выказаць пэўныя заўвагі, якія носяць пераважна рэкамендацыйны характар:

1. У палажэнні 8 (с. 14) адзначаецца, што дзейнасць рэлігійных арганізацый перашкаджала пашырэнню колькаснага складу камсамола і яго ўплыву сярод моладзі. Аднак удзел моладзі ў дзейнасці рэлігійных арганізацый у дысертацыі не разгледжаны.

2. Заслугоўвае большай увагі ацэнка дзейнасці маладзёжных некамсамольскіх гурткоў і арганізацый, якіх аўтар налічвае больш за 20 (с. 49). Нягледзечы на тое, што большасць дадзеных арганізацый мела культурна-асветніцкі характар і аказала пэўны ўплыў на станаўленне культуры і мастацтва Савецкай Беларусі, гісторыя іх дзейнасці ў дысертацыі паказана толькі ў кантэксце рэпрэсій з боку савецкай улады.

3. Аўтару можна было бы больш пераканаўча абгрунтаваць храналагічныя рамкі даследавання. З пачаткам Другой сусветнай вайны ў 1939 г. БССР не перастала існаваць, а перад камсамолам Беларусі стаялі задачы па сацыялістычным пераўтварэнням на ўз’яднаных землях Заходняй Беларусі.

4. Моладзь у дысертацыі разглядаецца ў першую чаргу як аб’ект дзяржаўнай палітыкі, таму варта было бы ў асобнай главе ці раздзеле ўдзяліць увагу вытокам і фарміраванню маладзёжнай палітыкі савецкай улады.

5. У “Спісе выкарыстаных крыніц” спасылкі на архіўныя матэрыялы пажадана было бы афармляць з указаннем назвы дакумента і старонкі як састаўнога элемента архіўных матэрыялаў (https://vak.gov.by/bibliographicDescription), паколькі ў большасці выпадкаў даследчык выкарыстоўвае ў практычнай дзейнасці не ўсю архіўную справу, а толькі яго частку (рэпрэзентатыўныя дакументы, якія непасрэдна адносяцца да

тэмы даследавання). Гэта дазволіла бы больш поўна вызначыць рэпрэзентатыўнасць і значэнне дакументальных крыніц, выяўленых аўтарам і выкарыстаных у даследаванні.

Выказаныя заўвагі не мяняюць агульнай станоўчай ацэнкі дысертацыйнага даследавання і не зніжаюць яго навуковай і практычнай значнасці.

**Заключэнне**

Дысертацыя Вячаслава Віктаравіча Даніловіча "Моладзь у грамадска-палітычным, сацыяльна-эканамічным і культурным будаўніцтве Савецкай Беларусі (1921–1939 гг.)" з'яўляецца самастойнай кваліфікацыйнай навуковай працай, поўнасцю адпавядае пп. 19–20 "Палажэння аб прысуджэнні вучоных ступеняў і прысваенні вучоных званняў у Рэспубліцы Беларусь" і "Інструкцыі аб парадку афармлення дысертацыі, аўтарэферата і публікацый па тэме дысертацыі". Дысертацыя прысвечана выяўленню ролі моладзі ў грамадска-палітычных, сацыяльна-эканамічных і культурных пераўтварэннях у Савецкай Беларусі ў перыяд 1921–1939 гг. і ўтрымлівае прынцыпіяльна новыя вынікі, сукупнасць якіх з'яўляецца значным дасягненнем у беларускай гістарыяграфіі.

Даніловіч Вячаслав Віктаравіч заслугоўвае прысуджэння вучонай ступені доктара гістарычных навук па спецыяльнасці 07.00.02 – айчынная гісторыя за:

– выдзяленне чатырох перыядаў станаўлення і развіцця арганізацыйных структур камсамола (I перыяд – 1921–1923 гг.; II перыяд – 1924–1927 гг.; III перыяд – 1928–1933 гг.; IV перыяд – 1934–1939 гг.) і іх ацэначную характарыстыку;

– раскрыццё асаблівасцей дзейнасці беларускіх і яўрэйскіх нацыянальных маладзёжных арганізацый у БССР;

– вызначэнне зместу і форм удзела моладзі ў грамадска-палітычным жыцці краіны (ідэйна-палітычная асвета, дзейнасць у дзяржаўных органах кіравання, грамадска-палітычная дзейнасць);

– устанаўленне накірункаў дзейнасці маладзёжных арганізацый па перабудове сацыяльна-эканамічнай сферы жыцця грамадства (вырашэнне сацыяльна-эканамічных праблем моладзі, удзел у індустрыяльным будаўнітве і мадэрнізацыі сельскай гаспадаркі);

– выяўленне зместу і асаблівасцей удзелу моладзі БССР ў духоўна-культурных пераўтварэннях у рэспубліцы (удзел у станаўленні і развіцці сістэмы адукацыі, антырэлігійная праца, удзел у культурным жыцці нацыянальных супольнасцяў БССР, культурна-масавая работа ў маладзёжным асяроддзі).

Водзыў на дысертацыю В.В. Даніловіча "Моладзь у грамадска-палітычным, сацыяльна-эканамічным і культурным будаўніцтве Савецкай

Беларусі (1921–1939 гг.)”, якая прадстаўлена на саісканне вучонай ступені доктора гісторычных навук па спецыяльнасці 07.00.02 – айчынная гісторыя, згодна загаду прарэктара па навуковай рабоце ГрДУ імя Янкі Купалы ад 07.06.2023 № 874 разгледжаны на навуковым семінары “Актульныя праблемы гістарычнай навукі” факультэта гісторыі, камунікацыі і турызму (пратакол № 1 ад 16.06.2023).

В.В. Даніловіч выступіў на семінары з дакладам. На семінары адбылася дыскусія, саіскальнік адказаў на ўсе пытанні.

У працы семінара прынялі ўдзел 13 членаў семінара з 16, у тым ліку 4 доктара (Т.Т. Кручкоўскі, С.В. Марозава, А.М. Нечухрын, С.А. Піваварчык) і 8 кандыдатаў гістарычных навук (Г.У. Васюк, А.С. Горны, А.М. Загідулін, Н.У. Казлоўская, У.Я. Ляўшук, М.У. Марцён, Н.Л. Улейчык, В.М. Чарапіца), кандыдат філасофскіх навук (І.А. Змітровіч).

Вынікі адкрытага галасавання: “за” – 13, “супраць” – няма, “устрымаліся” – няма.

Старшыня пасяджэння навуковага семінара,
кандыдат філасофскіх навук, дацэнт,
дацэнт кафедры усеагульнай і славянскай
гісторыі ГрДУ імя Янкі Купалы І.А. Змітровіч

Сакратар пасяджэння навуковага семінара,
кандыдат гістарычных навук, дацэнт,
дацэнт кафедры ўсеагульнай і славянскай
гісторыі ГрДУ імя Янкі Купалы Н.Л. Улейчык

Эксперт апаніруючай арганізацыі,
доктар гістарычных навук, дацэнт,
загадчык кафедры гісторыі Беларусі,
археалогіі і спецыяльных гістарычных
дысцыплін ГрДУ імя Янкі Купалы С.А.Піваварчык

З водгукам азнаёмлены.
В.В. Даніловіч
16.06.2023г.

Цэнтр кадравай і прававой працы

Подписи удостоверяю
Начальник ЦКиПД
Самойлик
16.06.2023